«Похоже, действительно, что-то назревает». Именно так журналисты России резюмировали итоги встречи В. В. Путина и А. Г. Лукашенко в Сочи и назначение послом России в соседней стране Михаила Бабича, делая вывод об этих событиях как логическом завершении кадровых перемен в белорусском правительстве. Типичная фейковая уловка, которая базируется на известной любому первокурснику философского факультета логической ошибке: «после этого» вовсе не означает «вследствие этого». Таков постулат, характеризующий подмену (замену, фальсификацию) причинно-следственных связей. Совпадение ряда важных политических событий и решений во времени и пространстве, как известно, дает обширный по набору противоречивых суждений простор для интерпретации произошедшего. Но вовсе не означает объективного информирования. Это и есть результат применения методов фейковой журналистики в том, каким образом формируется имидж политической жизни Беларуси в российском медиапространстве.

На наш взгляд, подобная установка непродуктивна и чревата формированием ложной картины о Беларуси в массовом сознании россиян. Сводить все к фигуре А. Г. Лукашенко и создавать весьма одиозные телепамфлеты в стиле позднего, «пожелтевшего», НТВ не есть принцип объективного отражения в российском медийном пространстве белорусских реалий.

**Вераніка Канюта**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)*

## УЛАДЗІМІР КАЗАЧОНАК І ЯГО РОЛЯ Ў ВЫДАННІ ПАДПОЛЬНАЙ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

Уладзімір Казачонак, які ў гады Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у выпуску падпольнай «Звязды», у пасляваенны час быў адным з прэтэндэнтаў на рэдактарства ў газеце. Па ўспамінах падпольшчыкаў, Уладзімір Сцяпанавіч рабіў многае дзеля таго, каб выданне ўбачыла свет. Іншыя, называючы Казачонка госцем падполля, увогуле аспрэчвалі яго дачыненне да ваеннай «Звязды». Аднак экспертыза газетных нумароў, праведзеная спецыяльнай камісіяй пасля Перамогі, пацвердзіла адваротнае.

Найбольш дакладна і, напэўна, сумленна сваю ролю ў выданні газеты пасля вайны вызначыў сам Уладзімір Казачонак. Ён казаў, што няправільна паказана роля асобных таварышаў у стварэнні падпольнай

газеты, якая, на думку падпольшчыка, мела калектыўнага рэдактара-рэдкалегію – Вячаслава Нікіфарава, Ядвігу Савіцкую і ўласна яго.

І гэта найбольш верагодная версія. Ва ўмовах ваеннага часу наўрад ці нехта з падпольшчыкаў думаў пра тое, якую пасаду ён займае. Не было і канкрэтных прызначэнняў. Пасля трагічнай гібелі рэдактара першага падпольнага нумара «Звязды» Уладзіміра Амельянюка, а таксама арышту многіх іншых падпольшчыкаў выпуск газеты аднавіўся без усялякіх загадаў. Людзі, якія мелі дачыненне да выдавецкай дзейнасці і былі аб'яднаны агульнай мэтай, сумленна рабілі сваю справу.

Трэба сказаць, што з пачаткам Вялікай Айчыннай вайны Уладзімір Казачонак прыбыў у Магілёўскі ваенкамат, адкуль яго накіравалі на зборны пункт начсаставу запасу ў Чавусы. Затым былі Клімавічы, дзе ён, ужо палітрук асобнага батальёна сувязі 49-й роты, займаўся камплектаваннем роты з тых байцоў, часці якіх адступалі. Пасля заканчэння дыверсійна-разведвальнай школы ў складзе падрыхтаванай групы спрабаваў перайсці лінію фронту. Не атрымалася.

У пошуках партызанаў Уладзімір Казачонак прайшоў усю Чэрвеньшчыну, але безвынікова. Як ён сам потым расказваў, «у лесе, што недалёка ад вёскі Грабянец, абсталяваў сабе шалаш, у якім некаторы час хаваўся» [2]. Даведаўшыся ад мясцовых жыхароў, што ў Мінск усё ж можна дабрацца, не натрапіўшы на немцаў, 4 лістапада 1941 г. выправіўся ў дарогу.

У горадзе Казачонак спыніўся ў свайго цесця, але на Мала-Серабранскай ён жыў нядоўга. Калі цесця забіў нямецкі патруль, мачыха выгнала яго з дому. Не маючы сродкаў на існаванне, Уладзімір Казачонак пайшоў у родную вёску. Толькі і там доўга не затрымаўся: паліцыя, завербаваная немцамі з крымінальнікаў, незадаволеных савецкай уладай людзей, учыняла над мясцовым насельніцтвам зверскія расправы.

У беларускую сталіцу Уладзімір Казачонак вярнуўся ў сярэдзіне студзеня 1942 года. Даведаўся, што ў Мінску існуе падпольная арганізацыя. Неўзабаве ён ужо сам пачаў займацца зборам разведданых аб варожых гарнізонах, якія перадаваў у партызанскія атрады. З берталетавай солі, цукру і сернай кіслаты ствараў выбуховыя пакеты, дзякуючы чаму ажыццяўляліся дыверсіі ў горадзе. У прыватнасці, былі падпалены Мінская абутковая і лямцавая фабрыкі, дзе немцы выраблялі для сваіх вайскоўцаў абутак.

Як пісаў у дакладной запісцы сакратару ЦК КП(б) Беларусі Панцеляймону Панамарэнку Уладзімір Казачонак, аднойчы «да яго на кватэру зайшлі Шугаеў і Вячаслаў Нікіфараў, адзін з кіраўнікоў

падполля, які ўзначальваў агітацыю і прапаганду ў горадзе. Апошні паведаміў, што ў канцы мая загінуў Уладзімір Амельянюк, арганізатар выпуску першага падпольнага нумара газеты “Звязда”» [2]. Казачонак, які да вайны працаваў у друку, пагадзіўся ўзяцца за арганізацыю ў горадзе выдання падпольнай газеты.

Яшчэ было не ясна, дзе працягваць выпуск «Звязды». На кватэры Воранавых (там быў надрукаваны першы нумар) гэта было немагчыма: бацьку і сына арыштавалі гестапаўцы. Пошук кватэры пад тыпаграфію даверылі Уладзіміру Казачонку. Менавіта дзякуючы яму 2-і і 3-і нумары падпольнай газеты, а таксама з дзясятак лістовак убачылі свет на кватэры па вуліцы Выдавецкай, дзе гаспадарыла Таццяна Якавенка.

У той дзень, калі гітлераўцы арыштавалі многіх падпольшчыкаў, Уладзімір Казачонак чакаў Вячаслава Нікіфарава ў падпольнай рэдакцыі – той павінен быў прынесці апошнія зводкі Саўінфармбюро. Не дачакаўся таварыша па падполлі ён і ў наступныя два дні. Стала ясна: неадкладна трэба пакідаць горад. Каб не паставіць пад удар гаспадароў, ён перанёс шрыфты на кватэру Савіцкай, хоць захоўваць іх там было небяспечна. Перад зыходам у партызаны разам з наборшчыкам падпольнай газеты Хасанам Александровічам паспелі яшчэ напісаць і распаўсюдзіць заклік да мінчан.

У брыгаду «Дзядзькі Колі» Уладзімір Казачонак прыйшоў 24 кастрычніка 1942 г. У лістападзе яго прызначылі камандзірам групы ў 33 чалавекі, якую ён павінен быў перавесці за лінію фронту. Гэта былі хворыя і параненыя партызаны, у лясных умовах ім наўрад ці ўдалося б перажыць зіму. Казачонак выканаў пастаўленую задачу: лінія фронту была паспяхова пераадолена, людзі перададзены Мінскаму абкаму партыі, які ў той час знаходзіўся ў прыфрантавой вёсцы.

Уладзіміру Казачонку пашчасціла больш, чым многім яго калегам па выданні падпольнай «Звязды». Перажыўшы вайну, ён працаваў у Беларускім дзяржаўным выдавецтве, Акадэміі навук БССР.

*Бібліяграфічныя спасылкі*

1. Дастанка, М. Е. Газета «Звязда» ў гады Вялікай Айчыннай вайны (Чэрвень 1941 – май 1945 гг.) / М. Е. Дастанка. – Мінск : Выд. БДУ імя У. І. Леніна, 1970. – 193 с.
2. Канюта, В. Уладзімір Казачонак – госць ці герой падполля / В. Канюта // Звязда. – 2017. – № 19 (28383). – С. 6.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 1440. – Воп. 3. – Спр. 730.